УДК 821.161.3.09-3

# МАСТАЦКАЯ ПЕРСАНАЛОГІЯ ПРОЗЫ ЯКУБА КОЛАСА ФІЛАСОФСКА-АКСІЯЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

**А. І. Белая**

*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт;*
*Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*
*alba.57@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца некаторыя тыпы персанажаў празаічных твораў Якуба Коласа, створаных у першай трэці XX стагоддзя. Філасофска-аксіялагічны аспект тыпалогіі мае на ўвазе вылучэнне тыпаў персанажаў, якія рэпрэзентуюць універсальныя дамінанты чалавечага жыцця і каштоўнасці, значныя для аўтара.

*Ключавыя словы:* тыпалогія; фактар; персанаж; канцэптуальныя рысы; эстэтыка-філасофскі змест.

# ARTISTIC PERSONOLOGY OF YAKUB KOLAS'S PROSE: PHILOSOPHICAL AND AXIOLOGICAL ASPECT

**A. I. Belaya**

*Baranavichi State University*
*Baranavichi, Republic of Belarus*
*alba.57@mail.ru*

The article examines some types of characters in Yakub Kolas' sprose created in the first third of the 20th century. Philosophical and axiological aspect of typology refers to the selection of character types that represent the universal dominants of human life and values that are significant for the author.

*Key words:* typology; factor; character; conceptual features; aesthetic-philosophical content.

Пісьменнікі заўсёды ўзводзілі да тыпу сукупнасць асоб з жыцця і літаратуры. Вылучэнне тыпаў персанажаў, якія ўтрымліваюць у сабе самыя істотныя рысы эпохі, мастацкага напрамку, сістэмы каштоўнасцей пісьменніка, з'яўляецца важнейшай задачай літаратуразнаўства пры вывучэнні і творчасці асобных аўтараў, і літаратурнага працэсу ў цэлым, і асобных яго стадый. Даследаванне мастацкай персаналогіі сведчыць, што пэўны характар/тып можа выступаць як аб'ект псіхалагічнага паказу, сацыяльнай тыпізацыі, быць сродкам рэалізацыі значных для пісьменніка ідэй і каштоўнасцей. Мастацкая персаналогія беларускай прозы першай трэці XX стагоддзя пераважна мужчынская (азначэнне Ю. Лотмана) і мае ў сваёй аснове фактар культуры (тыпы «маленькага» чалавека, «лішняга» чалавека, «новага» чалавека). Асноўныя аспекты тыпалогіі – сацыяльна-гістарычны, побытавы, аксіялагічны, архетыповы. Аксіялагічны аспект аб'ядноўвае тыпы персанажаў, якія рэпрэзентуюць ідэі і каштоўнасці, значныя для аўтара.

Адзін з традыцыйных прадстаўнікоў персанажнай сферы беларускай літаратуры – «лясны чалавек»: лоўчы, паляўнічы (часта гэта адна з іпастасяў палясоўшчыка). У фарміраванні яго асобы надзвычай уплывовым з'яўляецца характар жыццядзейнасці. Вобраз паляўнічага ў новай беларускай літаратуры часта выступае як адна з дзвюх сутнасцей палясоўшчыка, на канцэпцыю вобраза якога паўплывалі перш за ўсё ўзоры, назапашаныя, як піша Ант. Адамовіч, «сціплай нашай літаратурай беларускай»: вобраз Тараса з паэмы К. Вераніцына, старога лесніка Я. Лучыны, «нават у некаторай меры вобраз "ляснога чалавека" – "Дзеда Завалы" Ядвігіна Ш.» [1, с. 397]. З пачатку XX стагоддзя тып палясоўшчыка/паляўнічага церпіць істотныя канкрэтна-гістарычныя змены, але працягвае захоўваць некаторыя ўстойлівыя асабовыя дамінанты: дасціпны розум, назіральнасць, адчуванне сувязі ўсяго існага. Ключавы вобраз гэтай галерэі – Міхал у паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Васіль Чурыла ў аднайменным апавяданні, Максім Заруба («Малады дубок»), Міхась («Чорт») – «гэта толькі варыянты таго ж Міхала з "Новае зямлі"» [1, с. 398].

У ранняй прозе Якуба Коласа, побач з універсальна- і нацыянальна-прэцэдэнтнымі вобразамі, з'яўляюцца мастацкія характары, народжаныя сацыяльнай рэчаіснасцю, але адаптаваныя для рэалізацыі пэўных філасофска-эстэтычных мэт. Пісьменнік адмаўляецца ад паказу вартай жалю ахвяры неспрыяльных абставін жыцця, што было ўласціва яго папярэднікам: К. Лейку, І. Піліпаву, Ядвігіну Ш., Цётцы, Змітраку Бядулю, У. Галубку. Герой прозы Якуба Коласа «не маленькі чалавек з прымітыўнымі думкамі, вечна баязлівы і хітры», – часта гэта па-багушэвічаўску дзівакаваты жартаўнік, дасціпны і кемлівы, які эвалюцыянуе «да героя са складаным унутраным жыццём, з шырокімі сацыяльна-этычнымі пошукамі» [цыт. па: 2, с. 97].

Асяроддзе разначынцаў яшчэ ў ХІХ ст. нарадзіла мноства новых прафесій і статусаў, з чым звязана прафесіяналізацыя літаратурных персанажаў. Прафесія ўплывае на змест жыццядзейнасці і напрамак фарміравання асобы, дазваляе ўдакладніць яе мастацкую канцэпцыю. Героі айчыннай прозы найчасцей кіруюцца ў настаўнікі або ў каморнікі. Да таго ж, сацыяльны і літаратурны тып каморніка набыў актуальнасць у сувязі з прыняццем у 1911 г. закона аб землеўпарадкаванні. У апавяданні Якуба Коласа «Нёманаў дар» каморнік – гэта «стары пан, якіх цяпер мала дзе сустрэнеш» [3, т. 5, с. 127], строгі тварам, з «фацэтнай» фігурай, у капелюшы з пяром. Хоць сялянскае шэсце за ім параўноўваецца з павуцінай, а сам каморнік – з «ёмкім павуком...» [т. 5, с. 128], аднак у аповедзе гучыць аўтарская павага да прафесійных прынцыпаў героя і годнасці яго паводзін. «…Не мая гэта бацькаўшчына і не для сябе мераю. Паслалі мяне сюды, і я павінен слухаць. <…> Прагоніце мяне, не дасцё зрабіць работу... біцца з вамі не буду» [т. 5, с. 131]. Гэтыя якасці маюць уплыў і на паводзіны сялян.

Стражнік, турэмшчык, жандар – увасобленыя этапы асабовай дэструкцыі. У рознай ступені індывідуалізаваны падобныя тыпы і ў творах Якуба Коласа («Соцкі падвёў», «На ростанях»). У сучасных даследаваннях прозы эпохі рубяжа асобы-разбуральнікі – чалавек-спажывец з паразітычным светапоглядам, чалавек-звер, які сімвалізаваў будучую грамадскую катастрофу, – пазначаны паняццем «антыгерой». Змена аксіялагічных крытэрыяў вядзе персанажаў да самаразбурэння, што, аднак, часта абумоўлена абсурднасцю грамадскіх устанаўленняў («Царскія грошы», «Хаім Рыбс», «Дзядзькаў сведка»).

Не адзінкавы ў айчыннай прозе тып ненаўмыснага забойцы, часта звязаны з канфліктам двух братоў. А ў творах 1920–1930-х гг. ужо з'яўляюцца сюжэты і персанажы, звязаныя з раскрыццём псіхалогіі злачынцы. Забойства дзіцяці ляжыць на сумленні «балахоўца» Івана Бадзейкі з аднайменнага апавядання Якуба Коласа (пры гэтым, прызнаючыся ў забойстве дзіцяці, Бадзейка ўтойвае ўдзел у забойстве пяці чалавек). Пры змене ўлады былы цясляр «здуру і з распусты, але па сваёй волі прыстаў да шайкі грабежнікаў» [т. 6, с. 266]. А дзе грабежніцтва, там і забойства, і гвалтаўніцтва – «усё, што палагаецца бандыту» [т. 6, с. 284]. Як бы ні стараўся апраўдацца Бадзейка, што забіў яўрэйскага хлопчыка «з матываў жаласці да сіраты» [т. 6, с. 266], яму ніяк не ўдавалася заглушыць думку: «забіць чалавека – гэта значыць забіць самога сябе» [т. 6, с. 286]. У хуткім часе яна жахліва спраўдзілася.

Спецыфічнае ідэйна-мастацкае напаўненне набывае ў прозе эпохі рубяжа тып кантрабандыста. Яго сацыяльна-ментальны абрыс абазначаны ў змесце апавяданняў Якуба Коласа «Балаховец» і «Агатка».

Адной з ментальных дамінантаў героя-беларуса з'яўляецца творчая інтэнцыя, у тым ліку ў адносінах да ўласнасці і гаспадарання. Адметнае месца сярод мастацкіх характараў айчыннай прозы займае «чалавек на хутары». Вобраз Цімоха Бабуры ў аповесці «Адшчапенец» рэпрэзентуе не толькі распаўсюджаны сацыяльны тып, але і сістэму каштоўнасцей, звязаных з філасофскім асэнсаваннем прадмета ўласнасці. Мець «сваё» асабліва важна для чалавека ў хісткім свеце. Хутарок надзвычай дарагі Бабуру цяпер, калі становішча яго «няпэўнае, невыразнае, цёмнае і страшнае» [т. 12, с. 168]. Пасля рэвалюцыі «рэфрэн» гаспадара ўвогуле зрабіўся анамальным тыпам.

З праблемай уласнасці звязаны і такі тып персанажа, як злодзей. «Культавым» творам беларускай прозы першай трэці ХХ стагоддзя ў гэтых адносінах можна лічыць апавяданне «Малады дубок». Андрэй Плех – псіхалагізаваны, індывідуальна адметны вобраз-характар. Разважаючы пра пэўную долю рызыкі, Андрэй Плех суцяшаў сябе: «…хто ў лесе не злодзей, той дома не гаспадар». Праз учынкі і маўленне сваіх герояў Якуб Колас праводзіць думку,

запачаткаваную ў нашай літаратуры М. Гусоўскім: не ўсякая пакража – злачынства. «Ну, украў, ну, ссек, хай цябе ліха сячэ; ды не рабі ж ты на здзек чалавеку», – гаварыў сам сабе ляснік Максім Заруба, замятаючы «сляды неўпільнованага злодзея» [т. 5, с. 207]. Андрэй, які зрабіў такое пекла на душы беднага лесніка, зусім і не збіраўся чыніць з яго ніякага здзеку. Ён, як і ўсе астатнія, быў упэўнены: «…у лесе красці не грэх. Гэта не тое, што залезці да чалавека ў хату… А князя чорт не возьме, калі ён, Андрэй, ссячэ адзін дубок» [т. 5, с. 210]. Нават сам пан ляснічы ў фінале апавядання гаворыць Плеху: «…то які ж бы ты быў гаспадар, каб не краў у лесе?..» [т. 5, с. 225].

Часам здаецца, што аўтар бязлітасны да героя. Так, калі Андрэй «досвіта …кешкаўся ў хляве», хаваючы дубовыя камлюкі, свіння «спакойна ляжала ў сваім бярлогу і, здавалася, ніколечкі не дзівілася, як бы даўно ведаючы, што і чалавек часамі бывае не лепшы за яе» [т. 5, с. 217]. І ўсё ж пасля таго, як Плех адчуў сябе вялікім злачынцам, які ўласнымі рукамі загубіў чалавека, прызнаўся ва ўсім пану ляснічаму і прасіў не караць Максіма, пісьменнік пагаджаецца: «…Андрэй сапраўды не такі вінаваты, як гэта крычыць яму кожную хвіліну чулае сумленне» [т. 5, с. 225]. У творы выразны філасофскі матыў асабістай свабоды і адказнасці: ты можаш быць гаспадаром у сваёй хаце, у панскім лесе, уласным лёсе, але твая свабода заканчваецца там, дзе яна пачынае абмяжоўваць свабоду іншага чалавека.

Пятрусь Ігнатовіч па мянушцы Чарнамор – галоўны герой твора «Стары канакрад». Ён, як і бядулеўскі Ліканор, не адмаўляецца красці. Але гэта ўжо не той акуратны, нефальшывы чалавек. Якуб Колас нібы папярэджвае, што з-пад кантролю духоўнасці і правасвядомасці імкнуцца вырвацца часта нематываваныя, падсвядомыя сілы.

Канцэпцыя вобраза кулака пераважна вынікае з мастацкай рэпрэзентацыі псіхалогіі гультая і зайздросніка. Даволі распаўсюджаны матыў, калі заможнікі, у тым ліку Ігнат Чыкілевіч (аповесць «Адшчапенец») шукаюць ратунку ў сацыяльнай мімікрыі. Разам з тым Якуб Колас імкнецца да аб’ектыўнасці ў характарыстыцы Чыкілевіча. Ігнат – «абароцісты, смякалісты чалавек, спрытны гаспадар, жыве наводшыбе». Як вынік – «індывідуальна абложаны…» [т. 12, с. 117], ужо не гаспадар свайго лёсу і маёмасці. У жыцці Чыкілевіча здараецца найвялікшы казус: ліхая доля змусіла яго думаць… «як абкрасці самога сябе», дапяць да дабра, схаванага на чорную часіну. Баронячы набытае, Ігнат кінуўся на калгаснікаў з сякерай, каб канчаткова стаць зброяй і ахвярай «класавай нянавісці… у актыўнай форме» [12, с. 200].

У 1930 г. М. Прышвін ахарактарызаваў кулакоў як носьбітаў тытанічнай сілы жыццёвага генія. А праз год запісаў, што чалавека «расчлянілі»: чалавек-кулак і чалавек-пралетарый – розныя істоты. Герой Якуба Коласа з абурэннем гаворыць: «падзялілі ўсіх на кулакоў, серадпякоў, беднякоў і батракоў, калгаснікаў і некалгаснікаў, павыдумлялі нейкіх рупараў і кулацкіх падпявалаў» [т. 12, с. 222]. У час калектывізацыі з’явіліся «адшчапенцы»-аднаасобнікі, сабатажнікі, «індывідуальна/цвёрда абложаныя», «нехацімцы», «выхадзімцы» [т. 12, с. 212]… Хутаранец Цімох Бабура мае думку, што бедныя вяскоўцы-калгаснікі з аднаго батрацкага стану перайшлі ў другі. У нечым, можа, ён і лепшы, але «як былі батракі, дык батракамі і засталіся» [т. 12, с. 169].

У творах Кандрата Лейкі, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Максіма Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі сцвярджаецца значнасць рамяства, якое дапамагала выжыць у перайначаным свеце. Адметная фігура ў галерэі таленавітых рамеснікаў – калгасны брыгадзір муляр Лапко (аповесць «Адшчапенец»). Яго любілі і шанавалі не толькі за тое, што дзівак браў меншую плату за больш дасканалую работу (гэта кампенсавалася творчай радасцю), – ён быў «не муляр-прафесіянал, а муляр-мастак, бо ў сваёй творчасці… унікаў штампаваных форм і спосабаў работы» [т. 12, с. 155].

Творчая асоба ва ўсёй паўнаце філасофска-эстэтычнай канцэпцыі – Сымон-музыка ў аднайменнай паэме Якуба Коласа. Апавяданне «Драматург і лірычны паэт» мае адзнакі пародыі і, адпаведна, раскрывае ўнутраную негрунтоўнасць таго, што парадзіруецца, – экзерсісы амбітных, але не вельмі здольных і не зусім пісьменных аўтараў. Апавяданне «Трыумф» выяўляе занепакоенасць Якуба Коласа змястоўнай вартасцю як мастацкіх твораў, так і самога чалавека, што ідзе ў літаратуру.

І. Навуменка прызнаваў значнасць маладых герояў Якуба Коласа, ацэньваў асобы Карагі і Талаша як прынцыповыя мастацкія адкрыцці савецкага часу, але ўсё ж справядліва лічыў, што найбольш значныя маштабныя тыпы і характары класік стварыў на аснове перадачы індывідуальнай псіхалогіі і эмоцыі. Падобную думку выказаў А. Адамовіч. І ўсё ж творцы

супраціўляюцца стандарту. Вобраз-характар Лабановіча жывы, змястоўны, і гэтым пераадольваецца кан'юнктурная схема яго палітычнай самаідэнтыфікацыі.

Пачатак класіфікацыі настаўніцкіх вобразаў у творчасці Якуба Коласа паклалі два асноўныя тыпы: «балотная вада» і «крынічны струмень», якія на сёння ўсебакова даследаваны. Асоба Лабановіча акумулюе лепшыя рысы тыпу настаўніка. Разам з тым у яго канцэпцыі назіраецца тагачасная тэндэнцыя перабольшваць рэвалюцыйнасць настаўніцтва, што адбілася ў мастацтве. Падобным шляхам мусіў прайсці і Лабановіч. Настаўнік «і сам ведае, што рана ці позна, а стаць шчыльней да якой-небудзь рэвалюцыйнай арганізацыі яму прыйдзецца. Ён чуе, што трэба зрабіць нейкі новы крок у жыцці, крок важны і небяспечны» [т. 13, с. 365]. Лексемы «рана ці позна», «прыйдзецца», «трэба» ўказваюць на вымушаную ідэнтыфікацыю героя.

Айчынная проза рабіла пэўныя подступы да асэнсавання тыпу прафесійнага вучонага. Алегарычным вобразам «прафесара»-крумкача ў «казцы жыцця» «На ўсё ёсць прычына» Якуб Колас рэпрэзентуе разгубленасць прыхільнікаў эвалюцыі перад сляпой сілай стыхійнага бунту.

Класіфікацыя літаратурных асоб па прафесіі ўзыходзіць да тыпалогіі, бо не зводзіцца толькі да сацыяльнай ідэнтыфікацыі, а мае і сімваліка-метафарычны сэнс. Прысутнасць мастацкага тыпу доктара абумоўлена матывамі хваробы і вар'яцтва як метафарычнымі станамі асобы ў эпоху рубяжа. У дактарах і лекарах, пасля ўздзеяння «доўбні і агню», маюць патрэбу браты Усход і Захад, героі «казкі жыцця» («Хвароба»), але абмеркаваць «з вока на вока» працэс лячэння ім не дае «новая Хвароба – Граніца» [т. 7, с. 88].

«Новы» чалавек эпохі рубяжа – гэта хутчэй не вынік, а рух рэалістычнага героя да ідэалу. Як сцвярджаў Кузьма Чорны, чалавеку цяжка змяніцца адразу. Але гэта адбылося ў калгасе «Хваля рэвалюцыі». У аповесці «Адшчапенец» Якуб Колас іранічна заўважае, што калгаснікі робяць ураджанне «новай пароды людзей»: рухавыя, «гладкія, падкормленыя і нейк па-свойму адзетыя», без той замкнёнасці і заклапочанасці, якая «характарызуе насяленне старой вёскі» [т. 12, с. 148]. Рэпліка, што яны нібы нешта страцілі, мае падтэкст. І гэтае «нешта» – асабістая свабода і ініцыятыва.

Бурлівая эпоха актуалізавала ў жыцці і літаратуры пасіянарны тып асобы. Фактычна, пасіянарыі – людзі, што робяць іншых заложнікамі сваёй энергіі і могуць выклікаць супярэчлівыя адносіны. Бунтарамі па асабовай дамінанце, а не паводле палітычнай кан'юнктуры з'яўляюцца ў творах Якуба Коласа Пiліп («Выбары старшыні»), Цімох Жыга («На ростанях»). Філасофская праблема пасіянарнасці асэнсоўваецца Якубам Коласам ужо ў «Казках жыцця». Што лепей, запытвае пісьменнік у аднайменным творы: пражыць век «ціха, спакойна, не пазнаўшы, як міла жыццё, ці пазнаць яго хараство і вартасць цаной вялікага няшчасця?» [т. 7, с. 46]. Але менавіта пасіянарыі часта ідуць па шляху найбольшага супраціўлення, каб найлепшым спосабам дасягнуць мэты.

Такім чынам, у творчасці таленавітага пісьменніка канкрэтна-рэалістычны паказ чалавека заўсёды спалучаецца з яго эстэтыка-філасофскім спасціжэннем. Нацыянальная адметнасць суб'ектаў мастацкай персаналогіі прозы Якуба Коласа не выключае наяўнасці ўніверсальных канцэптуальных рыс, абумоўленых эстэтыка-філасофскім зместам вобразаў. Мастацкі тып носьбіта «філасофіі цярпення» ў творах пісьменніка эвалюцыянуе ў этыка-эстэтычным плане. Найбольш значныя вобразы-тыпы і характары Якуб Колас стварыў, улічваючы асаблівасці гістарычнага, маральна-этычнага вопыту і ментальныя характарыстыкі беларусаў, а таксама іх трансфармацыю/дэфармацыю ва ўмовах зменлівага свету. Працэс эстэтыка-філасофскай і мастацка-псіхалагічнай інтэрпрэтацыі чалавека пацвярджае, што вобразы людзей могуць быць эталоннымі. А чым больш эталонаў адбілася ў свядомасці асобы, тым багацейшы яе ўнутраны, духоўна-маральны свет і больш высокая здольнасць да ацэнкі новых аб'ектаў, працэсаў, з'яў рэчаіснасці.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Адамовіч, Ант. Да гісторыі беларускае літаратуры / Ант. Адамовіч. – Мінск: Выдавец ІП Зміцер Колас, 2005. – 1464 с.

2. Белая, А. І. Беларуская проза першай трэці XX ст.: станаўленне сістэмы персанажаў, тыпы і эвалюцыя мастацкіх характараў: дыс. д-ра філал. навук: 10.01.01 / А. І. Белая. – Мінск, 2019. – 282 л.

3. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас. – Мінск: Беларус. навука, 2008–2012. – Т. 1–20. Далей цытаты падаюцца паводле гэтага выдання з пазначэннем у дужках адпаведнага тома і старонкі.